*С.В.Зыгмантовіч, дацэнт*

# БЕСПЕРАПЫННАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ АДУКАЦЫЯ: АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ

Паняцце “бесперапынная адукацыя” сёння часта ўжываецца ў псіхалагічнай і педагагічнай літаратуры. Аднак змест яго трактуецца неадназначна. Вельмі часта пад бесперапыннай адукацыяй разумеецца пераемнасць паміж рознымі ўзроўнямі адукацыі, узаемасувязь паміж вучэбнымі праграмамі гімназій, ліцэяў і каледжаў і тымі універсітэтамі, пры якіх яны створаны або з якімі заключаны дагаворы па падрыхтоўцы спецыялістаў. Нярэдка яна ўяўляецца як пажыццёвая адукацыя, пачынаючы з дзіцячага садка і заканчваючы рознымі формамі адукацыі дарослых. Мы пад сістэмай бесперапыннай адукацыі разумеем сукупнасць адукацыйных праграм, інфармацыйна-камунікацыйных сетак, якія забяспечваюцца дзяржаўнымі і іншымі каналамі фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў і арыентаваны на задавальненне пазнавальных па- трэбнасцей асобы.

Задача прафесійна-адукацыйнай інфраструктуры бібліятэчнай сферы – фарміраванне прафесіяналізму бібліятэчных кадраў, пастаянная актуалізацыя прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў бібліятэкараў у адпаведнасці з новымі ўмовамі працы.

Галоўная роля ў сістэме бесперапыннай адукацыі належыць базавай адукацыі. Веды, уменні, навыкі, атрыманыя ў працэсе навучання, складаюць аснову прафесійных якасцей спецыяліста, вызначаюць узровень яго прафесійнай кампетэнцыі.

У нашай краіне склалася сістэма бібліятэчнай адукацыі, якая мае чатыры асноўныя ўзроўні: сярэдняя спецыяльная адукацыя, вышэйшая адукацыя, падрыхтоўка навуковых кадраў, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі.

Першы ўзровень у арганізацыйным плане прадстаўлены Магілёўскім бібліятэчным тэхнікумам, мінскім лінгвагуманітарным

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

комплексам “гімназія-каледж” № 24 і Гродзенскім дзяржаўным каледжам мастацтваў.

Другі ўзровень сістэмы бібліятэчнай адукацыі складаюць факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў і адпаведны факультэт у Віцебскім дзяржаўным універсітэце.

Што характэрна для развіцця прафесійнай бібліятэчнай адукацыі?

Як бачым, адбываюцца павелічэнні суб’ектаў адукацыйнага працэсу, дыверсіфікацыя прафесійнай адукацыі па тыпах навучальных устаноў, тэрмінах навучання, формах атрымання адукацыі. Ва ўмовах прагназуемага попыту на выпускнікоў бібліятэчных спецыяльнасцей (па прагнозах Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь да 2015 г.) магчыма адкрыццё ў пэўных навучальных установах новых аддзяленняў, факультэтаў па падрыхтоўцы спецыялістаў бібліятэчнай сферы.

Тэндэнцыі развіцця прафесійнай адукацыі звязваюцца з наступнымі фактарамі:

– наша краіна адносіцца да краін, для якіх характэрна масавая вышэйшая адукацыя;

– інтэграцыя з сусветнай сістэмай адукацыі, стварэнне сістэмы адкрытай адукацыі дзяржаў-удзельніц СНД;

– пашырэнне інтэграцыі паміж сярэднімі спецыяльнымі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі (аб’яднанне ў адзін навучальны комплекс ССНУ– ВНУ);

– пераход да двухступеньчатай сістэмы вышэйшай адукацыі (бакалаўрыят, магістратура);

– увядзенне новай сістэмы прыёму ў ВНУ;

– развіццё дыстанцыйнай формы атрымання вышэйшай адукацыі;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

– мадэрнізацыя вучэбнага працэсу, змены ў змесце адукацыі, формах навучання і кантролю;

– развіццё рынку адукацыйных паслуг вядзе таксама і да адкрыцця навучальных установ іншых дзяржаў на тэрыторыі нашай краіны, якія прапануюць свае адукацыйныя паслугі;

– пашыраецца ўзаемасувязь прафесійнай адукацыі з вытворчай сферай.

Такім чынам, звыклая для нас мадэль прафесійнай адукацыі ўсё больш прыходзіць у супярэчнасць не толькі з рэаліямі будучага дня, але і нашага часу і знаходзіцца ў стадыі рэфармавання.

Наступны ўзровень адукацыйнай сістэмы – дадатковая бібліятэчная адукацыя, накіраваная на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў. Яна прадстаўлена наступнымі звёнамі і ўключае:

– адукацыйныя ўстановы вышэйшай і дадатковай адукацыі ў сферы культуры і мастацтва – факультэт перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў культуры БДУ культуры і мастацтваў, Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры;

– інстытуты павышэння кваліфікацы розных міністэрстваў і ведамстваў (інстытуты павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў розных узроўняў праводзяць курсы павышэння кваліфікацыі для супрацоўнікоў школьных бібліятэк);

– курсы павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры і мастацтва пры рэгіянальных органах кіравання культуры;

– бібліятэкі-метадычныя цэнтры;

– інавацыйныя адукацыйныя структуры рознай ведамаснай прыналежнасці.

Нягледзячы на поспехі ў галіне фарміравання сістэмы, адукацыйныя структуры не ў стане задаволіць пастаянна ўзрастаючыя патрэбнасці галіны ў рэгулярным аднаўленні ведаў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

яе кадравага патэнцыялу і своечасовай адаптацыі бібліятэкараў да рашэння новых вытворчых задач.

Асноўныя прычыны гэтага:

– скарачэнне дзяржаўнага фінансавання мерапрыемстваў, звязаных з перападрыхтоўкай і павышэннем кваліфікацыі кадраў па ўсіх галінах культуры;

– адсутнасць нарматыўных дакументаў, якія б ставілі дзелавую кар'еру спецыяліста ў залежнасць ад узроўню яго прафесіяналізму і рэгулярнасці аднаўлення ведаў ў сістэме бесперапыннай адукацыі;

– адсутнасць рэгіянальнай сеткі адукацыйных устаноў, якія б мэтанакіравана займаліся дадатковай прафесійнай бібліятэчнай адукацыяй;

– нізкія тэмпы інфарматызацыі адукацыйнай сферы бібліятэчнай справы;

– адсутнасць сістэмы метадычнай дапамогі рэгіянальным адукацыйным структурам з боку рэспубліканскіх цэнтраў дадатковай адукацыі.

Кірункі ўдасканалення сістэмы дадатковай адукацыі бачацца ў:

– распрацоўцы канцэпцыі дадатковай прафесійнай бібліятэчнай адукацыі;

– фарміраванні сістэмы дзяржаўнага заказу на перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў па ключавых кірунках мадэрнізацыі галіны; забеспячэнні мэтавага фінансавання найбольш буйных і значных адукацыйных праектаў шляхам уключэння ў прафесійную праграму “Культура Беларусі”, адлюстраванні ў штогадовых зводных планах Міністэрства культуры асноўных мерапрыемстваў бібліятэк;

– дапамозе развіццю адукацыйнай дзейнасці ў галіне павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў з боку секцыі бібліятэчнай прафесіі, кадраў і бесперапыннай адукацыі ББА;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

– развіцці практыкі павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў на міжведамаснай аснове;

– рэгіяналізацыі дадатковай адукацыі праз стварэнне цэнтраў бесперапыннай адукацыі ў рэгіёнах, іншых інавацыйных адукацыйных структур, распрацоўцы мэтавых рэгіянальных праграм павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў;

– развіцці і ўкараненні дыстанцыйных формаў дадатковай прафесійнай адукацыі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ